ISSN 1561-8323 (Print)
ISSN 2524-2431 (Online)

## *СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫЕ НАУКИ*

*SOCIAL SCIENCES AND HUMANITIES*

УДК 821.161.3.09 Поступило в редакцию 10.10.2024
https://doi.org/10.29235/1561-8323-2025-69-1-76-82 Received 10.10.2024

**Ж. С. Шаладонава**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ПРАСТОРА І СЭНСЫ Ў МАСТАЦКА-ВОБРАЗНЫМ АДЛЮСТРАВАННІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*(Прадстаўлена членам-карэспандэнтам С. С. Лаўшуком)*

**Аннотация.** Анализ опыта освоения пространства позволяет отметить устойчивую тенденцию наполнения пространственных объектов и явлений смыслами и последующего восприятия их как знаков человеческой духовности и культуры. В результате исследования семантики образов пространства в произведениях белорусской литературы выявлена их духовно-эстетическая сущность и символическая содержательность. Впервые в отечественном литературоведении при исследовании поливалентного явления пространственности в художественных текстах проблемно объединены эстетическое видение авторов, философская углубленность их мышления, стремление к постижению цивилизационно-культурной логики развития общества. Такие способы художественного моделирования пространства дают возможность продемонстрировать его имиджевые ресурсы в геопоэтизации народа и страны, воплощении национальной аксиологии, морально-этических идеалов и бытийных смыслов. Выявление идейно-смысловой содержательности образов пространства в произведениях Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка, И. Шамякина, В. Гниломедова позволило раскрыть приемы и способы творческого освоения писателями окружающего мира, воплощения фундаментальных основ национального образа жизни и отражения эволюционных процессов в обществе, выявления при этом духовности белоруса, специфики его мышления, мировоззрения. В иследовании продемонстрированы новые подходы постижения сущности человека через онтологию пространства и ее образно-символическое воплощение в белорусской классике.

**Ключевые слова:** пространство, человек, белорусская литература, национальная духовность, семантика, символ

**Для цитирования.** Шаладонава, Ж. С. Прастора і сэнсы ў мастацка-вобразным адлюстраванні беларускай літаратуры / Ж. С. Шаладонава // Доклады Национальной академии наук Беларуси. – 2025. – Т. 69, № 1. – С. 76–82. https://doi.org/10.29235/1561-8323-2025-69-1-76-82

**Zhanna S. Shaladonova**

*Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Republic of Belarus*

# SPACE AND MEANINGS IN THE ARTISTIC AND IMAGINATIVE REPRESENTATION OF BELARUSIAN LITERATURE

*(Communicated by Corresponding Member Stepan S. Lavshuk)*

**Abstract.** The analysis of the experience of space exploration allows us to note a stable tendency of filling spatial objects and phenomena with meanings and their subsequent perception as signs of human spirituality and culture. As a result of the semantics study of the space images in the works of Belarusian literature, their spiritual and aesthetic essence and symbolic content are revealed. For the first time in Belorussian literary criticism at studying the polyvalent phenomenon of spatiality in literary works, aesthetic vision of the authors, philosophical depth of their reflections, and the desire to understand civilizational and cultural logic of the society development are problematically combined. Such methods of artistic space modeling provide us an opportunity to demonstrate its image resources in the geopoeticization of the people and the country, the embodiment of

© Шаладонова Ж. С., 2025

national axiology, moral and ethical ideals and existential meanings. The identification of ideological and semantic content of spacial images in the works of Ya. Kupala, Ya. Kolas, M. Tank, I. Shamyakin, V. Gnilomedov allows us to reveal the techniques and methods of creative development of the surrounding world by writers, the embodiment of the fundamental principles of the national lifestyle and the reflection of evolutionary processes in society, revealing the spirituality of the Belarusian, the specifics of his thinking and worldview. New approaches to understanding the essence of man through the ontology of space and its figurative and symbolic embodiment in Belarusian classics are demonstrated in the study.

**Keywords:** space, man, Belarusian literature, national spirituality, semantics, symbol

**For citation.** Shaladonova Zh. S. Space and meanings in the artistic and imaginative representation of Belarusian literature. *Doklady Natsional'noi akademii nauk Belarusi = Doklady of the National Academy of Sciences of Belarus*, 2025, vol. 69, no. 1, pp. 76–82 (in Belarussian). https://doi.org/10.29235/1561-8323-2025-69-1-76-82

**Уводзіны.** Фундаментальная катэгорыя рэчаіснасці, першааснова і спосаб існавання чалавека, матэрыі, свету, прастора здаўна прыцягвала ўвагу вучоных і мысліцеляў. Канкрэтызацыі ўяўленняў аб прасторы ў яе ўзаемадзеянні з чалавекам адлюстраваны ў працах буйных філосафаў, такіх як Арыстоцель, Платон, Г. Лесінг, Г. В. Ф. Гегель, О. Шпенглер, П. Фларэнскі, М. Хайдэгер, М. Эліадэ, М. Мерло-Панці, Д. Міхалеўскі, А. Осіпаў і інш., вядомых прыродазнаўцаў і геакультуролагаў, у ліку якіх Р. Дэкарт, І. Ньютан, У. Вярнадскі, А. Гетнер, В. Сямёнаў-Цян-Шанскі, Л. Берг, А. Эйнштэйн, К. Зауэр (C. Sauer), П. Савіцкі, Л. Гумілёў, І-Фу Туан (Yi-Fu Tuan), П. Царашковіч, Д. Замяцін, В. Лаўрэнава і інш. Духоўна-філасофскія пошукі чалавецтва па асэнсаванні прасторы адлюстроўваюць імкненні да гарманічнай уладкаванасці ў навакольным свеце і ўяўляюць важнейшы паказчык эвалюцыйнага развіцця. У разуменні і трактоўцы прасторавасці няўхільна ўзмацняюцца, пачынаюць дамінаваць культурна-антрапалагічныя фактары, у выніку чаго адметнасці тэрыторыі ўсё часцей звязваюцца з фізічнымі і псіхалагічнымі характарыстыкамі насельніцтва, яго светабачаннем і светаразуменнем, суадносяцца з духоўна-інтэлектуальным, творчым развіццём. Адзначыўшы залежнасць чалавека ад навакольных ландшафтаў, вучоныя звяртаюць увагу і на антрапагенны фактар ландшафтаўтварэння, які распаўсюджваецца на сэнсавыя сферы. У шматвекавой гісторыі вывучэння прасторы вылучаецца ўстойлівая тэндэнцыя напаўнення прасторавых аб'ектаў і з'яў культурна дэтэрмінаванымі прыкметамі і ўспрымання іх як знакаў духоўнасці і культуры.

У выніку мастацка-эстэтычнага засваення элементы прасторы пераўтвараюцца ў знакавую сістэму, становяцца прыродным матэрыялам культуры. Мастацкія вобразы адлюстроўваюць светапогляд і важнейшыя духоўна-быційныя арыенціры чалавека, працэсы яго стваральнага энергетычнага ўзаемадзеяння з навакольным светам. Сімвалічная, ідэйна-эстэтычная змястоўнасць вобразаў прасторы прадвызначае напоўненасць сэнсамі жыцця чалавека.

Прасторавая праблематыка як важны і перспектыўны напрамак вывучэння структуры, семантыкі, паэтыкі мастацкіх тэкстаў вывучалася ў працах Г. Башляра, А. Лосева, М. Бахціна, Д. Ліхачова, Ю. Лотмана, У. Тапарова, Г. Гачава, І. Свірыды, М. Эпштэйна, А. Бораня і інш. У беларускім літаратуразнаўстве засяроджаная і прадуктыўная цікавасць да прасторы праявілася ў даследаваннях М. Гарэцкага, І. Замоціна, І. Навуменкі, М. Мушынскага, В. Жураўлёва, У. Гніламедава, С. Лаўшука, Т. Шамякінай, Я. Гарадніцкага, І. Чароты, А. Шалемавай, З. Мельнікавай, Т. Тарасавай, А. Белай, І. Саверчанкі, А. Бельскага, Г. Кісліцынай, А. Мельнікавай і інш. Актывізацыя ўвагі да праблем прасторы, якая сёння назіраецца ў айчыннай гуманітарыстыцы, абумоўлена павышанай цікавасцю да гэтай тэматыкі як вядучай культурна-цывілізацыйнай парадыгмы другой паловы XX ст. І калі філосафы, этнографы, антраполагі спасцігаюць у пераважнасці аб'ектыўна-сэнсавую напоўненасць прасторавых аб'ектаў і з'яў, то літаратуразнаўцы даследуюць іх эстэтычныя характарыстыкі і чалавеказнаўчы патэнцыял, увасобленыя ў мастацкіх творах.

Айчынныя даследчыкі літаратуры адзінадушныя ў прызнанні выключнай ролі ландшафтна-прасторавых элементаў у паўнакроўнай рэалізацыі аўтарскай задумы твора, раскрыцці характараў, маральна-этычнага патэнцыялу, тлумачэнні этнапсіхалогіі, этнакультуры, нацыянальнай ідэі. Так, акадэмік У. Гніламедаў фарміраванне беларускага этнасу цесна звязвае з прыродна-прасторавым асяроддзем, беларускую нацыянальную самабытнасць у многім абумоўлівае тэрыторыяй. Вучоны лічыць неабходным па-філасофску паглыбленае асэнсаванне прыроднага свету як усяго існага, ставячы яго (свет) у адзін шэраг з фундаментальнымі паняццямі матэрыі, універсума, сусвету. Знаны беларускі культуролаг, тэарэтык літаратуры, Т. Шамякіна засяро-

джваецца на адчуванні пісьменнікамі нацыянальных ландшафтаў і спецыфіцы іх мастацкага ўвасаблення. Аналізуючы спецыфіку праламлення прасторавай культуры народа ў літаратуры, вучоны сваю асноўную ўвагу скіроўвае на раскрыццё цеснай спалучанасці мастацкай прасторы класікаў з міфалогіяй. Вядомы беларускі вучоны-славіст І. Чарота важную ролю надае прасторавым фактарам у этнахарактаралогіі, працэсах нацыянальнага самавызначэння. На шырокім фальклорным і літаратурным матэрыяле вучоны раскрывае значнасць і адметнасці архетыпа балота ў нацыянальнай мадэлі свету беларусаў, звяртае ўвагу на распаўсюджанасць матываў мяжы і пераходнасці, пры гэтым падкрэслівае этнаграфічна-фальклорную аснову іх увасаблення ў айчыннай літаратуры. У працах А. Бельскага эстэтыка і паэтыка пейзажу разглядаецца ў цеснай узаемасувязі з блізкароднаснымі відамі мастацтва – музыкай, жывапісам. Ствараючы сістэмны аналіз пейзажнага жанру ў беларускай паэзіі XX ст., вялікую ўвагу вучоны надае эмацыянальным характарыстыкам пейзажу ў фарміраванні паэтычных вобразаў роднага краю. Выразна праяўленую ў сацыяльнай рэчаіснасці і ў літаратуры першай трэці XX ст. агульнакультурную тэндэнцыю цывілізацыйнага асваення прасторы акцэнтуе А. Белая. Даследчыца падкрэслівае багаты сімваліка-метафарычны патэнцыял «мастацкай геаграфіі», характарызуе прасторавыя вобразы, выяўленыя ў мастацкіх творах, як «локусы культуры».

У даследаванні ставіцца мэта раскрыць духоўна-эстэтычную сутнасць, сімваліка-метафарычную змястоўнасць і быційна-філасофскую глыбіню вобразаў прасторы ў беларускай літаратуры. Мэта даследавання канкрэтызуецца наступнымі задачамі: прадставіць вобразы прасторы, выяўленыя ў літаратурных творах, як паказчыкі геакультурнай самабытнасці Беларусі і раскрыць іх новыя сімвалічныя сэнсы праз аналіз глыбінных ідэйна-тэматычных пластоў твораў; вызначыць ролю вобразаў прасторы ў мастацкай артыкуляцыі аўтарскіх светапоглядных рэфлексій; паказаць мастацка-вобразныя рэсурсы выяўлення цывілізацыйнага пашырэння прасторы.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Комплексны і сістэмны аналіз мастацкіх твораў грунтуецца на спалучэнні культурна-гістарычнага, структурна-семіятычнага і герменеўтычнага метадаў. Матэрыял даследавання складаюць творы беларускіх аўтараў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка, І. Шамякіна, У. Гніламедава і інш.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Прасторавая праблематыка знаходзіцца ў пастаянна напружаным полі прыцягнення як сусветнай, так і айчыннай гуманітарна арыентаванай думкі. Прастора ўяўляе надзвычай удзячную і перспектыўную сферу для літаратуразнаўчых росшукаў. Пры ўсёй шматграннасці і глыбіні назапашанага аналітычнага вопыту даследчы патэнцыял гэтай фундаментальнай катэгорыі далёка не вычарпаны. Паглыбленыя аналіз паэтыкі літаратурных твораў, расшыфроўка іх падтэкставай структуры, далучэнне іншанацыянальнага мастацкага кантэксту дазваляе раскрыць новыя, арыгінальныя вобразна-сімвалічныя сэнсы прасторавых вобразаў. У даследаванні сінтэтычнай і полівалентнай з’явы прасторавасці ў літаратуры важна спалучыць эстэтычнае бачанне, філасофскія роздумы аўтараў і іх імкненне да спасціжэння цывілізацыйна-культуралагічнай логікі развіцця грамадства. Такі сістэмны і цэласны падыход садзейнічае найбольш поўнаму і шматаспектнаму раскрыццю духоўнасці беларуса, спецыфікі яго мыслення, светапогляду, месца ў соцыуме, адлюстраванню асноў нацыянальнага ладу жыцця і вызначэнню яго эвалюцыйнага характару.

Прастора гэта аб’ектыўна існуючая дадзенасць, якая звязана з геаграфічнымі аб’ектамі і матэрыяльнымі рэчамі, што фарміруюць і структуруюць яе, і якая ў выніку практычнай і пазнавальнай актыўнасці чалавека напаўняецца анталагічнымі сэнсамі і паняццямі, пераўтвараецца ў ментальную структуру. Вынікі пачуцця прасторы, яе ўсведамлення і засваення чалавекам адлюстраваны ў эстэтычных з’явах: вобразах і паняццях культуры, літаратуры ў прыватнасці, якія нясуць важную інфармацыю пра яго светапогляд, сістэму каштоўнасцей, адлюстроўваюць узаемадзеянне знешняга і духоўнага свету.

Майстэрства ўслухоўвацца ў прастору і разумець яе сімвалічныя сэнсы характарызуецца В. Тапаровым як прасторавая адоранасць, якой, на думку вучонага, былі пазначаны Ё. Гётэ, Э. Гофман, М. Гогаль, Ф. Дастаеўскі і інш. Мы перакананы, што «прасторавай адоранасці» не пазбаўлены беларускія аўтары, сярод якіх Францыск Скарына, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Янка Купала, Аркадзь Куляшоў, Іван Навуменка, Уладзімір Караткевіч, Уладзімір Гніламедаў

і многія іншыя. Пры дапамозе арыгінальных і непаўторных мастацка-выяўленчых сродкаў рэалізуюцца спосабы творчага бачання і інтэлектуальнага спасціжэння пісьменнікамі навакольнага свету ў складанай іерархіі, сукупнасці яго структурных кампанентаў, адбываецца канцэптуальнае выяўленне іх эстэтычнай і сімвалічнай напоўненасці і семантычных глыбінь. Іх расшыфроўка дазваляе інтэрпрэтаваць паэтычныя вобразы не толькі як прыродныя з’явы і маляўнічыя ландшафтна-тапанімічныя адзінкі, але, найперш, як культурную прастору, якая мае агульначалавечыя каштоўнасныя параметры і замацавана на сутнасных духоўна-нацыянальных канстантах. Зварот да твораў класічнай мастацкай спадчыны, у якіх суадносіны чалавека і прасторы асэнсоўваюцца ў аксіялагічным, маральна-этычным і эстэтычным вымярэннях, павінен стаць адным з дзейсных фактараў пераадолення дэфіцыту жывых і гарманічных стасункаў з рэальнасцю.

У паэтычнай інтэрпрэтацыі Якуба Коласа наасферная скаардынаванасць культуры і мыслення з прыродным космасам забяспечвае адухоўленасць кожнай яго праявы, творчае спасціжэнне дасканаласці і хараства, уладкаванасць і ўпарадкаванасць чалавечага быцця ў суадноснасці з гармоніяй навакольнага свету: «Не ў адной толькі нашай душы / Зерне ёсць хараства – / Аб ім казку складае ў цішы / Колас нівы, трава. / Не ў адным толькі сэрцы людзей / Іскра праўды гарыць – / Аб ёй песню пяе салавей, / Аб ёй рэчка журчыць» [1, с. 6]. Прыродна-прастораваe асяроддзе ў шэрагу іншых фактараў паўплывала на духоўна-асобаснае фарміраванне беларускіх класікаў, станаўленне іх сістэмы поглядаў на свет і жыццё, абазначыла ідэйна-тэматычныя прыярытэты творчасці. Ландшафтныя асаблівасці нацыянальнай тэрыторыі выяўлены як яе культурна-ідэнтыфікацыйныя рэсурсы, неад’емныя складнікі паўсядзённай дзейнасці беларуса і акумулятары яго жыццятворчай энергіі.

Так, у вершы Я. Купалы «Жняя» абмалявана прасветленае, нацыянальна самабытнае аблічча маладой сялянкі «з нашае старонкі». Эмблематычныя вобразы «спелых гоняў», «з каласкоў вяночка», «сярпочка, зубленага, сталёвага», «залатога жніва» афармляюць духоўны ландшафт верша, задзейнічаны ў каларытнай і трапнай нацыянальнай характаралогіі: «Як сама царыца / Ў залатой кароне, / Йдзе яна ў вяночку / Паміж спелых гоняў. / З каласкоў вяночак – Маладасці сведка – / На ёй зіхаціцца, / Як у садзе кветка. <…> А яна – царыца – / Весела, шчаслiва / Каранує песняй / Залатое жніва» [2, т. 3, с. 32–33]. Вобраз рольніка на палетках у аднайменным вершы Я. Коласа пазначаны велічна-духоўным арэолам, гарманічнай паяднанасцю з прыроднай стыхіяй быцця, а сялянская праца, што пераўтварае свет да лепшага, набывае статус сакральнага дзеяння, літургіі. Адаптаваны да беларускай геаграфічнай і псіхалагічнай прасторы топас поля выяўлены аўтарамі як сэнсажыццёвы цэнтр дзейнасці беларусаў, уваходзіць у шэраг фактараў фарміравання народнай духоўнасці, ментальнасці. У літаратурнай класіцы вяршынна адлюстраваны закладзеныя ў сялянскай земляробчай культуры, сялянскім светапоглядзе імпульсы творчага ўспрыняцця жыцця і натхнёнай працы. Інтэрпрэтацыя паэмы Я. Коласа «Новая зямля» праз прызму хайдэгераўскай канцэпцыі «ўкаранёнасці ў быцці» дазваляе асэнсаваць мару галоўнага героя пра зямлю, імкненне «ў грунт пусціць сваё карэнне» як вызначальную ўстаноўку ў фарміраванні быційнага характару ўладкавання народа ў навакольным свеце.

У паэзіі Я. Купалы і Я. Коласа знайшла адметнае эстэтычнае выяўленне прастора дома як цэнтра анталагічнай уладкаванасці і ўкаранёнасці беларуса, месца яго духоўнай і сацыяльна-культурнай адаптацыі. Менавіта з домам, які забяспечвае трывалае, стабільнае і ўстойлівае існаванне чалавека і адлюстроўвае жыццёвую працэсуальнасць, мастакамі слова звязваецца гісторыя роду, нацыі, дзяржавы. Таму найперш дом адлюстроўвае аўтарскія мадэлі нацыянальнага жыцця, з ім звязваюцца перспектывы самастойнага сацыяльнага і грамадска-гістарычнага развіцця народа. У паэме Я. Купалы «Яна і я» менавіта самастойнасць падобна пушкінскаму «самостоянью человека» вылучаецца як адна з умоў і сутнасных прыкмет гарманічнай мадэлі асобаснага і нацыянальнага жыццеўладкавання і гаспадарання: «Палац мой, бачыш, хоць і не багаты, / Але я *сам* (тут і далей курсіў наш. – *Ж. Ш.*) яго узбудаваў, / *Сам* сцены вывеў, клаў на кроквы латы / І *сам* пад стрых саломай пакрываў» [2, т. 6, с. 107].

Вобраз дома акумулюе шырокі спектр уяўленняў пра жыццёвыя і духоўныя традыцыі, каштоўнасці, маральна-этычныя нормы ў паэме Я. Коласа «Новая зямля». Апісанні традыцыйных абрадаў змяшчаюць прыкметы сакральнага ў жыцці і побыце беларусаў, абумоўліваюць да-

датковую прасякнутасць прасторы дома духоўнасцю, мудрым словам і малітвай. Паэтычнае жыццеапісанне, падпарадкаванае прыродным і каляндарна-абрадавым цыклам у адпаведнасці з традыцыямі, народнай этыкай і мараллю, разгортваецца ў сямейны летапіс, які сінхранізуецца з летапісам нацыянальна-гістарычным.

У гуманітарным асэнсаванні навакольны свет заўсёды ўспрымаецца як аб’ект пазнання і як прадмет эмацыянальна і псіхалагічна насычанага перажывання. Спалучэнне жыцця матэрыі і духу ў пісьменніцкіх мастацкіх прасторавых мадэлях ілюструе вектары духоўна-творчага развіцця беларуса, у працэсе якога адбываецца мэтанакіраванае пашырэнне яго ўнутранай прасторы. Філосафы лічаць, што «пашырэнне прасторы з’яўляецца адной з важнейшых прыкмет эвалюцыі біялагічнага віду і сацыяльных сістэм» [3, с. 3]. У беларускай класіцы паказаны разнастайныя працэсы асваення, пашырэння прасторы, наладжвання з ёй жывога і прадуктыўнага дыялогу, у тым ліку з дапамогай такіх цывілізацыйных новаўвядзенняў, як чыгунка і авіяцыя. Іх мастацкая інтэрпрэтацыя дастаткова неадназначная, што абумоўлена насцярожанасцю стаўлення чалавека да ўсяго новага, асабліва фактаў паскарэння жыцця, змены яго звыклых рытмаў. Але менавіта праз адчуванне палёту і спакушэнне хуткасцю ўсведамляліся бясконцыя магчымасці чалавечага духу, праз мэтанакіраваны рух адбывалася прыпадабненне гістарычнага развіцця тэхнічнаму, больш выразна акрэсліваліся скіраванасць чалавечага жыцця, культуры і гісторыі.

У трылогіі Я. Коласа «На ростанях» чыгунка выступае спадарожніцай на жыццёвым шляху настаўніка Лабановіча, для якога дарога – спосаб і стыль жыцця. Дзейны, настроены на перамены, герой імкліва нарошчвае свае ўнутраныя рэзервы шляхам назапашвання жыццёвага вопыту, асобаснага і прафесійнага развіцця і сталення, спасціжэння прастораў радзімы, адчування далучанасці да яе вялікага жыцця. Хуткасць цягніка карэлюе з унутраным паскарэннем чалавека, які знаходзіцца ў стане духоўна-маральнага руху да пастаўленых мэт. Чыгунка захоўвае і развівае сутнасныя семантычныя аспекты дарогі як скіраванасці і сэнсу жыцця, імкнення хутчэй уліцца ў яго плыні дзеля пашырэння духоўных даляглядаў, дынамічнага панарамнага асваення нацыянальнай прасторы.

Коласаўскія тэндэнцыі выяўлення чыгункі арыгінальна і шматпланава разгорнуты ў мастацкіх палотнах беларускай літаратуры, творах М. Лынькова, І. Навуменкі, І. Шамякіна і інш. Браняпоезд з дакладным вызначэннем маршруту «Петраград–Брэст» у аднайменным рамане І. Шамякіна адлюстраваў сутнасць аўтарскай канцэпцыі, якая заключалася ў тым, каб раскрыць складаныя перыпетыі гісторыі, што суправаджалі першыя месяцы станаўлення савецкай улады, заключэнне Брэсцкага міру. У рамане цягнік выступае сімвалам рэвалюцыі, арганізуючым вектарам у шматфактурным мазаічным палатне твора, сабраным з вялікай колькасці дзеючых асоб і іх псіхалагічна насычаных адносін, падзей, эпізодаў, сітуацый. Дзякуючы гэтаму цэментуючаму вобразу ўсё гэта разнастайнае мноства набывае сэнсавую маналітнасць, сюжэтна-кампазіцыйную паслядоўнасць і лагічную завершанасць, фарміруецца мастацкая сістэма каардынат вымярэння і асэнсавання гістарычнай праўды.

Мара чалавека аб палёце ў небе жыла на працягу ўсяго гістарычнага часу, асацыіравалася са свабодным і вольным жыццём у параўнанні з залежным зямным існаваннем. Гэтую думку ва ўсходнеславянскім літаратурным дыскурсе выявіў М. Пятрэнка ў лірычным вершы «Нядоля»: «Дивлюся на небо та й думку гадаю: / Чому я не сокіл, чому не літаю, / Чому мені, Боже, ти криллів не дав? / Я землю б покинув і в небо злітав!» [4, с. 16]. Калі ў пачатку XX ст. браты Райт ажыццявілі свой знамянальны палёт на планёры, пачаўся сапраўдны цывілізацыйны і тэхнакратычны бум у асваенні нябеснай і зямной прасторы, што знайшло адлюстраванне ў літаратуры. Авіяцыя стала вельмі папулярнай справай у СССР. У асобах лётчыкаў спраўджваліся самыя высокія і смелыя спадзяванні народа і краіны, імкненне да пакарэння яшчэ нязведанай прасторы Зямлі і Космасу.

Вяршынным творам у беларускай літаратуры 1930-х гадоў па ўслаўленні авіяцыі стаў верш Я. Купалы «Хлопчык і лётчык». У зачын яго мастацкай тканіны ўключаны семантычны ключ-сімвал сну: «Я – ведай – вялікі ўжо хлопчык / І ўмею ўжо лётаць у сне» [2, т. 5, с. 66]. Праз патэнцыял сну як «семіятычнага акна» (Ю. Лотман) гаворка пераводзіцца ў метафарычную прастору канцэптуальна глыбокіх роздумаў пра свой час. Наіўнасць хлопчыка – толькі метафара

для вымярэння сур'ёзнасці рэальнасці, якую жадае прадставіць аўтар. Герой верша звяртаецца да міфічнага лётчыка, а ў падтэкставай прасторы – да самога Сталіна. Хлопчык імкнецца давесці да правадыра думку, што лётчыкам яму хацелася б стаць дзеля таго, каб пашырыць далягляды, адчуць сябе свабодным. Праз вобраз хлопчыка-летуценніка Я. Купала прадстаўляе абагулены вобраз народа, які зацікаўлены ў адказным удзеле ў развіцці краіны. Вобраз лётчыка выбраны не выпадкова, бо той высокі самаадданы энтузіязм і апантанасць, якія ён увасабляе, былі найбольш запатрабаванымі і дзейснымі ўласцівасцямі чалавечай прыроды ў справе пабудовы новага адухоўленага грамадства.

У паэзіі М. Танка заходнебеларускага перыяду тэма асваення прасторы ў стане палёту знайшла сваё арыгінальнае мастацка-вобразнае ўвасабленне. У вершы «Матыль» апісваецца на першы погляд звычайная паўсядзённа-побытавая сітуацыя. Пасярод жытнёвых палеткаў зняволенага роднага краю, дзе пра існаванне самалётаў можна было толькі здагадвацца, малалетні хлопчык назірае за матылём і нібы ўслед за героямі вершаў Я. Купалы і Я. Коласа пра авіяцыю таксама выказвае неспатольнае жаданне ўзняцца ў неба, атрымаць радасць палёту і адчуванне свабоды. Палёт адкрываў магчымасць свабоды перамяшчэння і засваення новай шчаслівай прасторы, у ролі якой выступала сацыялістычная краіна. У словах маці хлопчыка, якія прагучалі своеасаблівым падагульненнем верша, бліскуча раскрыўся паэтычны правідэнцыяналізм М. Танка, яго ўпэўненасць у надыходзе светлай будучыні для ўсіх сыноў Заходняй Беларусі, непазбежнасці іх фізічнага і духоўнага ўзлёту: «Будзеш і ты, / сынку, лётаць высока... / Дай зараблю / я на хлеб табе, сокал...» [5, с. 105]. Маладое пакаленне прагнастычна далучаецца М. Танкам да кагорты «сталінскіх сокалаў», як называлі ў 30-я гады лётчыкаў-герояў у СССР. З дапамогай арніталагічнай метафары, на той час ужо напоўненай выразнай палітычнай змястоўнасцю, у вершы М. Танка, магчыма на падсвядома-інтуітыўным узроўні, ажыццяўляецца мадэляванне новых для беларускага народа рэалій, у палёце бачыцца новы эвалюцыйны спосаб пераадолення меж паміж дзяржавамі, паміж раз'яднаным народам.

Асваенне навакольнай прасторы ў пісьменніцкіх мастацкіх мадэлях, як правіла, атаясамліваецца з духоўнай адысеяй герояў, што застаецца важнейшай ідэйна-сэнсавай дамінантай твораў пачатку XXI ст. У рамане У. Гніламедава «Уліс з Прускі» лацінская форма імені Адысей трапна ўжываецца для характарыстыкі пошукавай сутнасці галоўнага героя Лявона Кужаля, адпаведнай яго светапогляднаму развіццю і духоўнаму сталенню. Аўтарам наглядна занатавана прасторавае вымярэнне фізічнай загартоўкі і духоўнага росту героя падчас вымушанай вандроўкі ў Амерыку. Прасторавы рух героя суправаджаецца актыўным спазнаннем свету, людзей, сябе, а пераадоленне пры гэтым «супраціўлення рэальнасці» толькі ўзмацняе ўнутраны стрыжань, крышталізуе асноўныя жыццёвыя правілы і прынцыпы. Вяртаючыся дамой, Лявон Кужаль усвядомлена і перакананна прымае значнасць сваёй асобы: «“California” параўнялася са статуяй Свабоды, потым мінула яе. Ён сачыў, як яна аддалялася, і непрыкметна для сябе перайшоў на карму. Глядзеў назад, на зямлю, з якою даводзілася развітвацца і на якой прыйшла да яго сталасць. Тут ён прайшоў праверку на трываласць, на права нешта значыць у гэтым свеце» [6, с. 379]. Эпізод вяртання героя ў сваёй ідэйна-сэнсавай напоўненасці, дэталёвым афармленні амаль ідэнтычна ўзнаўляе фінал падарожжа міфічнага Адысея ў інтэрпрэтацыі В. Мандэльштама: «Золотое руно, где же ты, золотое руно? / Всю дорогу шумели морские тяжелые волны, / И, покинув корабль, натрудивший в морях полотно, / Одиссей возвратился, пространством и временем полный» [7, с. 81].

**Заключэнне.** Мастацка-эстэтычнае і філасофскае асваенне прасторы беларускім прыгожым пісьменствам мае выразную наасферную светапоглядную скіраванасць, дае ўніверсальны досвед спасціжэння логікі і эвалюцыйнага руху гісторыка-культурнага і прыроднага быцця нацыі, адлюстроўвае яго адпаведнасць традыцыям і дыялектыку пераходу да новых цывілізацыйна апраўданых форм і мадэляў светаўладкавання. Прасторавыя вобразы ў творах айчынных аўтараў сімвалічна насычаны, пазначаны філасофска-анталагічнай і аксіялагічнай змястоўнасцю як феномены прыроды і культуры, вынікі ўзаемадзеяння чалавека з навакольным светам. Духоўна-культурныя і быційныя сэнсы і каштоўнасці, што адкрываюцца ў працэсе гэтага ўзаемадзеяння і знайшлі ўвасабленне ў літаратуры, спрыяюць больш глыбокаму пазнанню рэчаіснасці, усведамленню цэласнасці яе структурных элементаў і іх гарманізацыі.

Праз мастацка-вобразнае адлюстраванне эстэтыкі і сэнсава-сімвалічнай напоўненасці прасторы Я. Купалам, Я. Коласам, М. Танкам, І. Шамякіным, У. Гніламедавым і іншымі асвятляюцца фундаментальныя праблемы месца і ролі чалавека ў свеце. Аналіз семантыкі такіх рэпрэзентатыўных вобразаў, як поле, дом, дарога, чыгунка, авіяцыя і іншых дазволіў адзначыць асаблівасці тэрытарыяльнай арганізацыі беларускага грамадства, выявіць сутнасць і скіраванасць культурна-гістарычных працэсаў, раскрыць рэсурсы нацыянальнай і асобаснай ідэнтыфікацыі. Антрапалагічны характар даследавання прасторавых вобразаў і іх суадносін у мастацкіх творах абумоўлівае шырокі дыяпазон яго судакранання з разнастайнай літаратуразнаўчай праблематыкай і светапогляднымі задачамі далейшага развіцця паняцця прасторы ў рэчышчы актуальных кірункаў гуманітарных навук.

**Падзяка.** Работа выканана ў межах дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2021–2025 гады «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (заданне 6.2.11).

**Acknowledgments.** The investigation was performed within the state program of scientific research for 2021–2025 “Society and humanitarian security of the Belarusian state” (assignment 6.2.11).

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас; рэдкал.: М. У. Мясніковіч [і інш.]. – Мінск, 2007–2012. – Т. 7 / рэд. Т. С. Голуб. – 2009. – 501 с.
2. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала; рэдкал.: С. А. Андраюк [і інш.]. – Мінск, 1995–2003. – 9 т.
3. Михалевский, Д. В. Пространство и бытие: сб. ст. / Д. В. Михалевский. – СПб., 2017. – 477 с.
4. Поет-романтик Михайло Миколайович Петренко (1817–1862): твори: крит. та іст.-літ. матеріали / упоряд. О. Є. Петренко. – Київ, 2015. – 586 с.
5. Танк, М. Збор твораў: у 13 т. / М. Танк; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мінск, 2006–2012. – Т. 1: Вершы (1930–1939) / рэд. А. Л. Верабей. – 2006. – 373 с.
6. Гніламёдаў, У. В. Уліс з Прускі: раман / У. В. Гніламёдаў. – Мінск, 2006. – 380 с.
7. Мандельштам, О. Полное собрание сочинений и писем: в 3 т. / О. Мандельштам; сост. А. Г. Меца. – Изд. 2-е, испр. и доп. – СПб., 2017. – Т. 1: Стихотворения. – 711 с.

## References

1. Kolas Ja. *Collected works: in 20 vol. Vol. 7.* Minsk, 2009. 501 p. (in Belarusian).
2. Kupala Ja. *Complete collected works: in 9 vol.* Minsk, 1995–2003. (in Belarusian).
3. Mikhalevskij D. V. *Space and Being.* Saint Petersburg, 2017. 477 p. (in Russian).
4. *Romantic poet Mikhail Nikolaevich Petrenko (1817–1862): works, critical, historical and literary materials.* Kyiv, 2015. 586 p. (in Ukrainian).
5. Tank M. *Collected works: in 13 vols. Vol. 1: Poems 1930–1939.* Minsk, 2006. 373 p. (in Belarusian).
6. Gnilamjodaw U. V. *Ulysses from Pruska.* Minsk, 2006. 380 p. (in Belarusian).
7. Mandelshtam O. *Complete collected works and letters: in 3 vols. Vol. 1: Poems.* Saint Petersburg, 2017. 711 p. (in Russian).

## Информация об авторе

*Шаладонова Жанна Сергеевна* – канд. филолог. наук, доцент, вед. науч. сотрудник. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси (ул. Сурганова, 1/2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: jshaladonova@yandex.by.

## Information about the author

*Shaladonava Zhanna S.* – Ph. D. (Philology), Associate Professor, Leading Researcher. Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus (1/2, Surganov Str., 220072, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: jshaladonova@yandex.by.